

НОВЫ СМАК ЗНАКАМІТАЙ ПЛЯЦЁНКІ

3

ШТО Ў ЖНІЎНІ РАСКАЖА «АЛЕСЯ»

5



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

+TV ПРАГРАМА

18 ЖНІЎНЯ 2023 г. ПЯТНІЦА № 159 (30039)

## КОРАТКА

• **ВУП Беларусі ў студзені — ліпені вырас на 2,9 працэнта.**

• Узброеныя Сілы Беларусі атрымалі першую партыю верталётаў Мі-35.

• **Мінсельгасхарч: азімым рапсам ужо засеяна больш за палову запланаваных плошчаў.**

• ДПК: Літва пакінула на граніцы з Беларуссю ўсяго чатыры пункты пропуску. Акрамя аўтамабільнага транспарту граніцу дазволена перасякаць на веласіпедзе. Пешы парадак следавання забаронены.

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Мікалай ЛЕШЫК, начальнік галоўнага ўпраўлення раслінаводства Мінсельгасхарча:**

*«Апошнія тры гады азімы рапс засяваецца на плошчы 400 тысяч гектараў. Гэтая лічба аптымальная па структуры пасяўных плошчаў. Цяпер перад намі стаіць задача па ўдасканаленні тэхналогій, паколькі на гэтых плошчах нам неабходна атрымаць каля 1 млн тон алейнага семя рапсу за кошт павышэння ўраджайнасці. На дадзены момант азімым рапсам засеяна больш за палову запланаваных плошчаў. Лідарамі сталі Віцебская, Магілёўская і Мінская вобласці. Паколькі гэтыя рэгіёны знаходзяцца паўночней, завяршэнне сяўбы ў іх павінна быць ранейшым. Тэрміны абумоўлены патрабаваннямі тэхнічнага рэгламенту. Улічваючы памылкі папярэдніх гадоў, сёлета мы завершым сяўбу ў асноўным да 20 жніўня».*

ISSN 1990 — 763X

З першых вуснаў

# «АСНОЎНЫЯ ІДЭІ ЦЯПЕРАШНЯГА І БУДУЧАГА ПЕРСПЕКТЫЎНАГА СВЕТАЎЛАДКАВАННЯ Ў КНР І БЕЛАРУСІ СУПАДАЮЦЬ АБСАЛЮТНА»

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка сустрэўся з міністрам абароны Кітайскай Народнай Рэспублікі генерал-палкоўнікам Лі Шанфу.**



Фота БелТА.

Вітаючы госця, Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што Лі Шанфу цяпер — самая медыйная асоба ў свеце. «Таму што вашу актыўнасць, актыўнасць Кітайскай Народнай Рэспублікі па прасоўванні сваіх інтарэсаў, па прасоўванні асноўных ідэй па светаўладкаванні сёння чуе ўвесь свет», — растлумачыў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка заявіў, што асноўныя ідэі цяперашняга і будучага перспектыўнага светаўладкавання Кітайскай Народнай Рэспублікі і Беларусі супадаюць абсалютна. Па яго словах, краіны дэманструюць гэта цягам апошніх трох дзясяткаў гадоў.

«Мы абсалютныя прыхільнікі шматпалярнага свету. Мы абсалютныя прыхільнікі тэрытарыяльнай цэласнасці і адзінства межаў і тэрыторыі, якія склаліся пасля Другой сусветнай вайны. Мы за неўмяшанне ва ўнутраныя справы дзяржаў. Словам, уся тая палітра, на якой заснавана знешнепалітычная дзейнасць Кітая, уласцівая і нашаму кіраўніцтву», — сказаў ён.

Па словах Аляксандра Лукашэнкі, на працягу больш чым 30 гадоў беларускі бок падтрымліваў і падтрымлівае Кітай ва ўсіх яго памкненнях, таму што лічыць унутраную і знешнюю палітыку Кітайскай Народнай Рэспублікі абсалютна справядлівай, накіраванай на мірнае вырашэнне спрэчак і канфліктаў.

«На жаль, не па нашай віне свет сёння абсалютна нестабільны, праходзяць магутныя турбулентныя падзеі ў свеце. І нам даводзіцца быць моцнымі. Бо так склалася, што сілу заўжды паважаюць, — падкрэсліў беларускі лідар. — У нашай паліtyцы мы грунтуемся на моцнай эканоміцы, моцнай дыпламатыі. І я вельмі вам удзячны за вашу падтрымку ў сферы ваенна-тэхнічнага і ваеннага супрацоўніцтва. Мы ў гэтым плане перш за ўсё абапіраемся на нашых сяброў, і ў першую чаргу на Расійскую Федэрацыю і Кітай», — сказаў ён.

Аляксандр Лукашэнка выказаў спадзяванні, што першы візіт Лі Шанфу ў Беларусь будзе мець працяг. Па яго словах, гэты візіт вельмі важны для Беларусі. «І я хачу, каб вы ведалі: наша супрацоўніцтва (а яно вельмі значнае, і мы гэта ні ад каго не хавалі) ні ў якім разе не будзе накіравана супраць трэціх краін. Нам гэта не патрэбна, нам трэба абараніць свае дзяржавы і свае народы», — сказаў ён.

СТАР. 2

Жніво-2023

## ЗАЛАТЫЯ РУКІ АРШАНШЧЫНЫ



**Хлебаробы Аршанскага раёна актыўнымі тэмпамі кладуць у засекі тысячу за тысячай тон золата палёў. Усяго ў рэгіёне пад збожжавыя і зернебабовыя культуры адведзена амаль 30 тысяч гектараў і ўжо ўбрана 57 працэнтаў плошчаў. Сярэдняя ўраджайнасць у раёне ў гэтым годзе склала 31,2 цэнтнера з гектара. Адным з вядучых сельскагаспадарчых прадпрыемстваў Аршаншчыны з'яўляецца філіял «СГЦ «Задняпроўскі» ААТ «Аршанскі КХП», з перадавікамі якога мы знаёмімся сёння.**

Філіял «Селекцыйна-гібрыдны цэнтр «Задняпроўскі» Адкрытага акцыянернага таварыства «Аршанскі камбінат хлебапрадуктаў» на сёння асвоіў больш за 58 працэнтаў з запланаваных 5659 гектараў, адведзеных пад збожжавыя клін. Ва ўмовах нялёгкага надвор'я, якое сёлета значна знізіла ўраджайнасць ва ўсім паўночным рэгіёне, аграрыі атрымліваюць 26,3 цэнтнера з гектара, ужо намалочана амаль сем тысяч тон хлебнага золата. Нягледзячы на тое, што гэтае жніво па намалоце значна адрозніваецца ад мінулага, перадавікі ў гаспадарцы застаюцца нязменнымі.

СТАР. 3

Пасля размеркавання

## Працаваць у сельскай гаспадарцы нялёгка, але цікава

### Меркаванне маладога спецыяліста з кампетэнтным каментарыем

**Вераніка ДАВЫДЗЕНКА ўжо не студэнтка, а малады спецыяліст. Кожную раніцу ў якасці ветэрынарнага ўрача яна спяшаецца на адну з жывёлагадоўчых ферм сельгаспрадпрыемства «Савушкіна пушча» ў Камянецкім раёне.**



СТАР. 4

# «АСНОЎНЫЯ ІДЭІ ЦЯПЕРАШНЯГА І БУДУЧАГА ПЕРСПЕКТЫЎНАГА СВЕТАЎЛАДКАВАННЯ Ў КНР І БЕЛАРУСІ СУПАДАЮЦЬ АБСАЛЮТНА»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Беларускі лідар нагадаў, што яго звязваюць добрыя і блізкія адносіны са Старшынёй Кітайскай Народнай Рэспублікі Сі Цзіньпінам. «Я бязмерна паважаю свайго сябра, мы даўно з ім знаёмыя. Я прашу вас перадаць ад імя ўсяго беларускага народа самыя цёплыя пажаданні яму і яго сям'і за ўсё тое, што Кітай апошнім часам зрабіў для Беларусі», — сказаў ён. Аляксандр Лукашэнка таксама папрасіў перадаць добрыя пажаданні жонцы лідара КНР Пэн Ліюань.

У адказ Лі Шанфу падзякаваў Аляксандру Лукашэнку за асабістую сустрэчу. Ён перадаў беларускаму лідару прывітанне ад Сі Цзіньпіна. Міністр абароны Кітая адзначыў вялікія поспехі ў развіцці Беларусі і ролю ў гэтым кіраўніка беларускай дзяржавы. «Дазвольце выказаць шчырую і глыбокую павагу за ваш высокі ўклад у забеспячэнне міру і развіццё ва ўсім свеце», — сказаў міністр абароны Кітая. Лі Манфу нагадаў, што ў пачатку года адбыўся дзяржаўны візіт Прэзідэнта Беларусі ў Кітай, у ходзе якога кіраўнікі дзяржаў дасягнулі важных дамоўленасцяў па далейшым умацаванні двухбаковага ваеннага супрацоўніцтва, уключаючы ваенную сферу. «Мэтай майго візіту ў Беларусь з'яўляецца менавіта рэалізацыя важных дамоўленасцяў на ўзроўні кіраўнікоў дзяржаў і далейшае ўмацаванне двухбаковага ваеннага супрацоўніцтва», — сказаў Лі Шанфу.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

Ваеннае супрацоўніцтва паміж Міністэрствам абароны Рэспублікі Беларусь і Міністэрствам абароны Кітайскай Народнай Рэспублікі ажыццяўляецца ў адпаведнасці з Пагадненнем аб ваенным супрацоўніцтве ад 13 мая 2010 года. З 2013 да 2020 года адбылося 10 візітаў ваенных дэлегацый высокага ўзроўню ў КНР і 13 разоў такія дэлегацыі наведалі Рэспубліку Беларусь. На планавай аснове праводзіцца навучанне прадстаўнікоў Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь і НВАК у ваенных навучальных установах абедзвюх краін. Ладзяцца сумесныя антытэрарыстычныя трэніроўкі падраздзяленняў сіл спецыяльных аперацый Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь і падраздзяленняў паветрана-дэсантных войскаў ВПС Кітая. Гэтыя мерапрыемствы далі магчымасць абмяняцца вопытам, правесці зладжванне беларускіх і кітайскіх падраздзяленняў, стварыць падмурак для далейшага развіцця беларуска-кітайскіх адносін у сферы сумеснай падрыхтоўкі войскаў.

Каардынацыя двухбаковага ваенна-тэхнічнага супрацоўніцтва ажыццяўляецца ў рамках работы Беларуска-Кітайскага каардынацыйнага камітэта па супрацоўніцтве ў галіне ўзбраення і ваеннай тэхнікі. Да гэтага часу праведзена 18 пасяджэнняў камітэта (апошняе — 26 красавіка 2023 года ў Мінску), чарговае плануецца ў 2024 годзе ў Кітаі.

Актуальна

Валерый БЕЛЬСКІ:

# «ТУДЫ, ДЗЕ ВЫКЛЮЧАНА АГРЭСІЯ, ПРЫХОДЗЯЦЬ ІНВЕСТАРЫ»

**Прычыны, вынікі і эфектыўнасць стварэння народнага апалчэння ў Беларусі абмеркаваў з калектывам Мінскага завода шасцярэнек намеснік старшыні Савета Рэспублікі Валерый Бельскі падчас адзінага дня інфармавання. Нельга запалохаць краіну, народ якой як адзін супрацьстаіць агрэсіі, падкрэсліў ён актуальнасць такога кроку.**



Падчас сустрэчы, якую спікер абазначыў як таварыскую, была абмеркавана бягучая палітычная сітуацыя, перадумовы рашэння аб фарміраванні народнага апалчэння.

— Па сутнасці, гэта ўжо завяршальнае рашэнне фарміравання структуры нашай абароны. Яно шматграннае: мы маем рэгулярную армію, унутраныя войскі, павышаецца роля ў абароне краіны сістэмы міністэрства па надзвычайных сітуацыях і тэрытарыяльнай абароны з дапамогай народнага апалчэння, — заўважыў віцэ-спікер верхняй палаты. — Плюс стратэгічныя рашэнні, якія звязаныя з размяшчэннем тактычнай ядзернай зброі ў Беларусі. Усё гэта фарміруе цэласную сістэму абароны, якая здольная супрацьстаяць самым сур'ёзным пагрозам.

Валерый Бельскі акцэнтаваў увагу і на эканамічным аспекце, які дае надзейную абарону дзяржавы, бо «туды, дзе выключана агрэсія, прыходзяць інвестыцыі». І гэта важна для Беларусі, якая знаходзіцца на скрыжаванні транспартных шляхоў, якія трэба абараняць.

Народнае апалчэнне — добраахвотнае фарміраванне, і асноўнае ў ім — жаданне чалавека, таму людзі павінны ведаць асновы: куды пайсці, чым заняцца, да каго звярнуцца ў выпадку такога намеру, удакладніў спікер:

— Чалавеку трэба расказаць і паказаць, дзе ён можа знайсці сваё месца, дзе атрымаць зброю, каму ён павінен падпарадкоўвацца, у чым адрозненне службы ў апалчэнні ад службы ў рэгулярнай арміі, якое стаўленне да прысягі, якія асноўныя задачы. Важна данесці да людзей дзяржаўную палітыку, забяспечваць іх сістэмна апрацаванымі фактамі, бо найлепшы спосаб атрымаць веды — пагаварыць з тымі, у каго яны ўжо ёсць.

Нагадаем, што Законам «Аб народным апалчэнні», падпісаным кіраўніком дзяржавы ў ліпені, ствараюцца ўмовы для добраахвотнага ўдзелу беларусаў у забеспячэнні ваеннага палажэння, увядзенага ў адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінках краіны. Камплектаваць апалчэнне мяркуецца з невоеннаабавязаных асоб ці тых, хто закліканы на ваенную службу па мабілізацыі. Падрабязней пра размову намесніка старшыні з рабочымі мы раскажам у наступным нумары «Мясцовага самакіравання».

**Ірына СІДАРОК, фота аўтара.**

Дзеля міру

# СПЫНІЦЬ НАЦЫЗМ У ІМЯ БУДУЧЫНІ

## У Мінску пачаў работу ІІ Міжнародны антыфашысцкі кангрэс

**Па ініцыятыве Міністэрства абароны ў Беларусь прыбылі прадстаўнікі звыш 30 краін, каб папярэдзіць свет аб рэальнай пагрозе неафашызму. Форум «У імя будучыні чалавецтва, сумеснымі намаганнямі спынім неафашызм!» прызваны кансалідаваць адэкватныя міжнародныя сілы на платформе супрацьдзеяння распаўсюджанню фашызму і нацызму ў свеце, захаваць гістарычную праўду аб Другой сусветнай вайне.**



Разам з прадстаўнікамі ваенных дэлегацый, дыпламатычнага корпуса, замежнай навуковай і экспертнай супольнасці ў кангрэсе ўдзельнічаюць прадстаўнікі дзяржаўных органаў Беларусі, кіраўнікі асноўных рэлігійных канфесій, ветэраны Вялікай Айчыннай вайны, беларускія вучоныя і эксперты, кіраўнікі патрыятычных грамадскіх аб'яднанняў і палітычных партый.

На пленарным і секцыйных пасяджэннях будуць абмеркаваны пытанні ўрокаў гісторыі ў кантэксце забеспячэння нацыянальнай і міжнароднай бяспекі, эскалацыі міжнароднай напружанасці і ваеннай падрыхтоўкі ў сувязі з глабальнымі працэсамі адраджэння ідэй фашызму ў дзяржаўнай палітыцы шэрагу краін, згуртавання народаў у барацьбе з неафашызмам.

Сімвалічна, што ўдзельнікі кангрэса наведаюць Дзяржаўны мемарыяльны комплекс «Хатынь», дзе ўскладуць кветкі і высадзяць дрэвы памяці. Учора беларуская дэлегацыя, а таксама госці нашай краіны пабывалі на месцы масавага знішчэння фашыстамі і іх памагатымі ваеннапалонных («Шталаг 352»), дзе працуе 52-і асобны спецыялізаваны пошукавы батальён Міністэрства абароны. У памяць аб ахвярах генацыду ў Храме-помніку ў гонар Усіх Святых была праведзена малітва-рэквіем.

**Вераніка КАНЮТА.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Краіны Балтыі далучыліся да дэкларацыі G7 па Украіне




Эстонія, Літва і Латвія далучыліся да дэкларацыі G7 аб гарантыях бяспекі Украіны. Дакумент адначасова апублікавалі прэм'ер-міністры трох краін, паведамляе БелТА са спасылкай на агенцтва УНН.

Прэм'ер-міністр Эстоніі Кая Калас заявіла, што яны прадоўжаць дапамагаць Кіеву і будуць падтрымліваць яго на шляху да членства ў Паўночнаатлантычным альянсе і Еўрасаюзе. Пра тое ж паведаміў праз сацыяльную сетку прэм'ер-міністр Латвіі Крыш'яніс Карыньш. «Толькі сяброўства ў НАТА забяспечыць гарантыі бяспекі для Украіны, і мы з нецярпеннем чакаем найхутчэйшага прыняцця Кіева ў альянс», — напісала прэм'ер-міністр Літоўскай Рэспублікі Інгрыда Шыманітэ.

Гарантыі бяспекі Украіны ўключаюць пастаўкі сучаснай ваеннай тэхнікі, падрыхтоўку ўкраінскіх вайскоўцаў, абмен разведданымі і дапамогу ў сферы кіберабароны.

### У Гане заявілі, што паспяховы дзяржпераварот у Нігеры паставіць пад пагрозу ўсе дзяржавы ECOWAS



Пра гэта 17 жніўня заявіў міністр абароны Ганы Дамінік Ніцівул падчас сустрэч начальнікаў генштабаў Узброеных Сіл дзяржаў Эканамічнай супольнасці краін Заходняй Афрыкі (ECOWAS) у Акры, паведамляе ТАСС.

Ніцівул дадаў, што мяцежнікі ў Нігеры «супрацьдзейнічаюць намаганням, якія прыкладаюцца для вырашэння крызісу мірным шляхам». Паводле яго слоў, усе краіны ECOWAS прымуць неабходныя меры для аднаўлення канстытуцыйнага парадку ў Нігеры. У сераду ўвечары Al Hadath паведаміў, што ECOWAS прыступіла да актывацыі сваіх сіл хуткага рэагавання з мэтай аднаўлення канстытуцыйнага парадку ў Нігеры.

ТАСС нагадвае, што Афрыканскі саюз выступіў супраць магчымай інтэрвенцыі ў Нігер, дзе ў канцы ліпеня вайскоўцы зрынулі прэзідэнта Махамеда Базума і захапілі ўладу. Такім чынам, саюз выказаў нязгоду з пазіцыяй ECOWAS.

### На поўначы Канады масава эвакуіруюць насельніцтва з-за лясных пажараў

Улады распарадзіліся як мага хутчэй правесці абавязковую эвакуацыю насельніцтва са сталіцы прыпалярнага рэгіёна Елаўнайф, дзе пражывае 20 тысяч чалавек, а таксама з яшчэ некалькіх населеных пунктаў з-за пажараў, паведамляе сайт nashvancouver.com. Елаўнайф размешчаны ў 400 км на поўдзень ад Палярнага круга.

Жыхарам належыць пакінуць горад да паўдня пятніцы 18 жніўня. Шэйн Томпсан, міністр аховы навакольнага асяроддзя Паўночна-Заходніх тэрыторый, заявіў, што «сітуацыя з ляснымі пажарамі зноў прыняла найгоршы абарот». У аўторак улады Паўночна-Заходніх тэрыторый аб'явілі рэжым надзвычайнага становішча ў сувязі з бескантрольнымі ляснымі пажарамі.

Многія аўтамагістралі былі закрыты. Да эвакуацыі прыцягнута ваенна-транспартная авіяцыя. Больш за 200 лясных пажараў ужо спалілі шырокую тэрыторыю Паўночна-Заходніх тэрыторый. Калі не будзе дажджу, агонь можа дасягнуць Елаўнайфа на працягу выхадных.

Восем населеных пунктаў, у якіх пражывае каля 6800 чалавек, або 15 працэнтаў насельніцтва рэгіёна, ужо эвакуіравана. У гэтым годзе ў Канадзе адбылася рэкордная колькасць лясных пажараў. Згарэла больш за 21 000 кв. км тэрыторыі. На гэты момант у краіне зафіксавана больш за 1000 дзеючых ачагоў узгарання.

Запрашальнік

# НОВЫ СМАК ЗНАКАМІТАЙ ПЛЯЦЁНКІ

## Рэспубліканскі каравай-фэст «Бацькава булка» пройдзе ў Свіслачы 19 жніўня

**Ідэя фэсту ўзнікла пасля наведвання Прэзідэнтам мясцовай пякарні ў чэрвені пазамінулага года. Аляксандр Лукашэнка высока ацаніў смак свіслацкага хлеба, асабліва — здобнай пляцёнкі. Гэта стала свайго роду пасылам для раскруткі булкі, якая ў хуткім часе атрымала афіцыйную назву «Бацькава булка». Летась у гонар славутай здобы ў Свіслачы зладзілі рэспубліканскі фэст. Сёлета свята пройдзе другі раз.**

Падрыхтоўку вядзе спецыяльна створаны аргкамітэт пры Гродзенскім абласным упраўленні культуры. Асноўная праграма распрацавана Свіслацкім цэнтрам культуры і народнай творчасці. Кожны наведвальнік зможа адчуць сябе не толькі гледачом, але і паўнавартасным удзельнікам вясёлага і забаўляльнага шоу.

— Свята становіцца вельмі папулярным, бо яго тэма блізкая кожнаму, — зазначае **намеснік дырэктара раённага цэнтра культуры Святлана ДЗЯНІСАВА.** — Важнасць гэтага прадукту відавочная, а восем назваў хлебабулачных вырабаў увайшлі ў склад нематэрыяльнай культурнай спадчыны Беларусі. Усе яны будуць прадстаўлены на каравай-фэсце ў Свіслачы. Таксама падрыхтавана нямала пякарскіх конкурсаў як для аматараў, так і для прафесіяналаў гэтай справы.

На выстаўцы-конкурсе «Бацькаўшчына», напрыклад, прафесійныя пекары прадставяць у выпечцы гістарычныя аб'екты Беларусі. Летась тут знайшлі адлюстраванне і Белавежская пушча, і гродзенскія замкі, і старажытныя сядзібы.

Адным з самых цікавых абяцае стаць конкурс «Матулін каравай». Прыняць удзел у ім змогуць усе ахвотныя, у тым ліку пекарыаматары і хатнія гаспадыні. На свята пададзена 23 заяўкі. Сваё майстэрства ў кулінарным спаборніцтве можна будзе прадэманстраваць у дзвюх намінацыях: «Традыцыйны каравай» і «Сучасны каравай».

Кожны ўдзельнік павінен прадставіць адзін выраб вагой не менш за кілаграм. Калі гэта «Традыцыйны каравай», то ў хатніх умовах па традыцыйным рэцэпце гатуецца пірог, каравай ці булка. Вітаецца наяўнасць сямейнай гісторыі, якая звязана з вырабам.

У намінацыі «Сучасны каравай» прапануецца прадставіць кандытарскія вырабы на тэму «Вяселле».



Гэта можа быць пірог ці торт, які гатуецца без выпечкі з ужо гатовых інгрэдыентаў, напрыклад, пернікаў ці зефірны. Тут кожны можа прыкласці ўсю фантазію і здольнасці. Прадстаўлены на конкурс выраб павінен мець арыгінальную назву. Але мала толькі прыгатаваць. Яшчэ трэба яго цікава прэзентаваць, расказаць пра тэхналогію, рэцэптуру, гісторыю, чаму менавіта такі выраб стаў у сям'і традыцыйным, у чым яго адметнасць.

Пераможцы будуць вызначаны ў спецыяльных намінацыях. Гэта «Кулінарная спадчына», «Смак дзяцінства», «Самы вялікі каравай», «Арыгінальная прэзентацыя», «Незвычайнае спалучэнне інгрэдыентаў», «Арыгінальнае афармленне».

Па выніках конкурсу найлепшыя работы атрымаюць узнагароды — дыпломы і грашовыя прэміі.

Асобны конкурс адбудзецца для прафесійных пекараў і кандытараў. Яны прадставяць вялікі асартымент вырабаў, якія трапляюць да спажыўцоў не толькі вобласці, але і краіны. Вядома, не абыдзецца без дэгустацыі.

Падчас фэсту будзе працаваць шэраг цікавых лакацый. Напрыклад, лаўнжзона для адпачынку, дзе булка-гадалка ў жартоўнай форме прадкажа лёс.

Экскурсія з майстар-класам паведаміць аб шляху зерня да хлеба. Тут адбудзецца дэманстрацыя старажытных сельскагаспадарчых прылад. А на старых млынарных колах можна нават памалоць зерне. Экскурсійны майстар-клас завершыцца прыгатаваннем «Бацькавай булкі». Госці фестывалю змогуць пакаштаваць духмяную хлебную выпечку, а таксама прыняць удзел у конкурсе па ліцэнні «Бацькавай булкі», якая будзе ўручацца пераможцу.

Усе конкурсы так ці інакш звязаны з «хлебнай» тэмай. Напрыклад, у эстафеце «Бацькава міля» каманды будуць перавозіць мяхі з зернем. У конкурсе «Каравай, каравай, каго хочаш — выбірай» кожная пара ўдзельнікаў з завязанымі вачыма адной рукой павінна будзе ўпакаваць булку. Арганізатары спадзяюцца, што ўсіх наведвальнікаў свята зацікавіць праграма пад назвай «Булка-байкер-шоу», у склад якой уваходзіць манеўраванне і фігурнае катанне на матацыклах.

Не абыдзецца без захапляльнага спартыўнага спаборніцтва. На баскетбольную пляцоўку выйдуць каманды старшыні Гродзенскага аблвыканкама і Свіслацкага райвыканкама. Дарэчы, гульня пройдзе на пляцоўцы, адкрыццё якой адбудзецца напярэдадні матча. Такі падарунак гораду падчас свята ладзіцца ўпершыню.

У праграме — выступленні артыстаў беларускай і расійскай эстрады, марафон песень аматарскіх калектываў Гродзенскай і Брэсцкай абласцей, фольк-гуртоў і музычных тэатраў.

Напачатку свята ладзілася як мясцовае, але хутка перарасло ў рэспубліканскае.

Трэба сказаць, што беларусы славіліся сваёй выпечкай, старадаўнія рэцэпты якой аднаўлены і ўвайшлі ў спіс нематэрыяльнай культурнай спадчыны краіны. Захавальнікі традыцый прадставяць гэтыя вырабы на каравай-фэсце. У іх ліку — свіслацкая банкуха. Майстэрства прыгатавання гэтага торта-ёлачкі захавалася ў пасёлку Поразава. Таксама будзе прадстаўлены ржаны хлеб з Адэльска Гродзенскага раёна. Са Слоніма прывязуць знакаміты «паўлаўскі каравай» ад удзельніц народнага аб'яднання «чараўніцы-каравайніцы» з Навасёлкаўскага цэнтра культуры. На Слонімшчыне фестываль караваяў стаў брэндавым святам. А самы прыгожы трохпавярховы каравай паўлаўскія каравайніцы двойчы ўручалі Прэзідэнту краіны.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**
**Фота з адкрытых крыніц.**

# ЗАЛАТЫЯ РУКІ АРШАНШЧЫНЫ




***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)***

Застаць за адпачынкам Віктара Сямёнавіча Гарбачэўскага амаль немагчыма: кіроўца на МАЗе з яркааранжавымі бартамі стаіць на месцы не прывык. Яго машына пад надзейным кіраўніцтвам прафесіянала ўдала віруе па бяскрайніх залатых нівах, прымаючы ў камбайнаў налітае збожжа.

Віктар Сямёнавіч — мясцовы, у сельскую гаспадарку прыйшоў, як і шмат хто з калег, адразу пасля школы. Па-іншаму было немагчыма: і бацька, і дзед Гарбачэўскага ўсё жыццё працавалі ў гэтай сферы, прывіваючы Віктару працавітасць і ўпартасць у справе. Давялося яшчэ юнаку тады паспрабаваць сябе і на трактары, і на камбайне: адмалаціў амаль 20 сезонаў. Ужо ў сталым узросце змяніў пасаду камбайнера на кіроўцу машыны — гады бяруць сваё. Ужо больш за 10 гадоў ён працуе ў «Задняпроўскім» — з тых часоў, калі гаспадарку злучылі з саўгасам «Днепр». Усяго сельскагаспадарчы стаж Віктара Сямёнавіча — 30 гадоў з хвосцікам.

Кожны сезон мужчына выходзіць перадавіком, неадночы Гарбачэўскага ўшаноўвалі на абласных «Дажынках», аднак ён сваімі дасягненнямі хваліцца не любіць, расказвае, што ўсё атрымліваецца нечакана. «Мая задача простая — акуратна перавезці збожжа ў зернясховішча. А вось наколькі многа яго будзе, парадуе ўраджайнасць і надвор'е — гэта справа выпадковая. Галоўнае — працаваць сумленна, тады і вынікі будуць», — дзеліцца кіроўца.

У гэтым годзе ён адзіны ў раёне перасягнуў мяжу ў тры тысячы тон перавезенага збожжа — канкурэнцыю не толькі ў гаспадарцы, але і ў цэлым раёне мужчыну не склаў ніхто. Кіраўніцтва «Задняпроўскага», як і шматлікія калегі Гарбачэўскага, верыць, што да канца жніва мяжа ў 4 тысячы тон будзе ім узята.

За высокімі дасягненнямі сталых калег у філіяле паспявае і маладое пакаленне. Маладзёжныя экіпажы бяруць пакуль што тысячныя вяршыні, сярод іх — малады перадавік Вадзім Лабуцін. Ён ужо каторы год атрымлівае новую тысячную зорачку на лабавое шкло айчыннага камбайна Palesse, на якім працуе чацвёрты сезон.

Вадзім пайшоў у сельскую гаспадарку не па дынастыі, а сам, па асабістым жаданні — хлопец з дзяцінства марыў працаваць на камбайне. Ён першы ў сям'і, хто абраў для сябе гэту нялёгкую прафесію. Пасля школы атрымаў спецыяльнасць у Дубровенскім дзяржаўным аграрна-тэхнічным каледжы і ўжо амаль 10 гадоў шчыруе ў «Задняпроўскім». Гэтае жніво шостае ў прафесійнай біяграфіі Вадзіма, практычна кожны год ён стабільна намалочвае тысячу тон, а вось планку ў дзве тысячы пакуль узяць не змог — максімальна рабіў 1700, але ўсё яшчэ наперадзе, тым больш што сіл і запалу ў маладога хлопца хапае. Падтрымлівае і натхняе камбайнера не толькі дома, але і на працы жонка Марыя, якая таксама працуе ў філіяле.

Вадзім і Марыя пазнаёміліся, як яны любяць жартаваць, непасрэдна ў полі, калі пачыналіся вясеннія палявыя работы. «Я тады была ў прапаведзе, і Вадзім дапамагаў мне з мяшкамі насення. Загарэлася каханне, як сустрэліся тады на полі, так і дагэтуль яго пакінуць не можам, але ўжо з-за працоўных абавязкаў», — усміхаецца Марыя. Дзяўчына па прафесіі майстар азелянення, але лёс вырашыла звязаць з сельскай гаспадаркай: працавала ў паляводстве, а пасля перавялася ў кладаўшчыкі. Цяпер яна вядзе ўлік прывезенага ў зернясховішча збожжа, узважвае машыны, кантралюе работу зернесушыльнага комплексу.

Маладая пара жыве ў вёсцы Крапіўна ў доме, які выдзеліла сям'і прадпрыемства. Асабістую гаспадарку пакуль не трымаюць — няма калі, тым больш што Вадзім і Марыя працуюць ад відна да відна. Падчас нашай сустрэчы ў полі у Лабуціных ішоў 30-ы дзень без выхадных. «Нічога, мы людзі вясковыя, звыклыя. Кожны ўсведамляе, што цяпер трэба хапаць кожную пагодлівую хвіліну, каб убраць з поля хлеб. Адпачнём зімой», — усміхаецца Вадзім. У вольны час пара захапляецца рыбалкай, прычым Маша па ўловах не саступае мужу.

Павіншаваць перадавікоў з новымі ў гэтым сезоне хлебнымі вяршынямі акурат на полі прыехалі прафсаюзны лідар аграрыяў раёна Вольга Нікіценкава, намеснік генеральнага дырэктара па арганізацыйна-кадравай, ідэалагічнай рабоце і рэжыме ААТ «Аршанскі мясакансервавы камбінат» Ніна Карпалава і прадстаўнікі філіяла «СГЦ «Задняпроўскі» ААТ «Аршанскі КХП».

«Сваёй штодзённай нястомнай працай вы забяспечваеце харчовую бяспеку нашай краіны. Прафесія хлебароба — адна з самых пачэсных і цяжкіх, шчыры вам дзякуй за стараннасць і адданасць прафесіі. Хочацца пажадаць вам моцнага здароўя, сямейнага дабрабыту і новых працоўных перамог», — звярнуліся да аграрыяў Вольга Нікіценкава і Ніна Карпалава, уручыўшы падарункі.

***Аляксандра ГВОЗДЗЕВА, фота аўтара.***

Надвор'е

# ТРАПІЧНАЕ ЛЕТА ПРАЦЯГВАЕЦЦА

**Да плюс 33 градусаў, кароткачасовыя дажджы і навальніцы чакаюцца ў Беларусі з 18 да 23 жніўня, паведамілі ў Рэспубліканскім цэнтры па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**

«У гэтыя выхадныя трапічнае паветра працягне панаваць на прасторах нашай краіны, а значыць, будзе захоўвацца спякотнае надвор'е. У такія дні людзей вабяць вадаёмы, тым больш што на сёння тэмпература вады ў рэках і вадаёмах Беларусі складае ад плюс 21 да плюс 25 градусаў. Таму, адпраўляючыся на адпачынак, будзьце вельмі ўважлівыя і асцярожныя», — папярэдзілі ў Белгідрамеце.

У суботу, 19 жніўня, месцамі па Беларусі прагназуюцца кароткачасовыя дажджы, прагрымяць навальніцы. Тэмпература паветра ўначы будзе ў межах ад плюс 15 да плюс 22 градусаў, а днём — ад плюс 25 градусаў па поўначы да плюс 33 градусаў па поўдні.

У нядзелю, 20 жніўня, месцамі па краіне прагназуюцца кароткачасовыя дажджы, навальніцы. Уначы тэмпература паветра дасягне плюс 15—21 градус, а днём — плюс 27—34 градусаў.

Згодна з папярэднім прагнозам сіноптыкаў, у панядзелак, 21 жніўня, тэрыторыю Беларусі будзе перасякаць франтальны раздзел, за якім у нашу краіну пачне паступаць умерана цёплае паветра з Заходняй Еўропы. Тэмпературны фон пачне паніжацца і наблізіцца да адпаведных для дадзенага перыяду значэнняў. Пры гэтым атмасферны ціск застанецца павышаным, а гэта значыць, што вялікай колькасці ападкаў да сярэдзіны наступнага тыдня па краіне не чакаецца.

Так, месцамі ў гэты дзень прагназуюцца кароткачасовыя дажджы, навальніцы. Уначы слупок тэрмометра паднімецца да плюс 13—20 градусаў, а днём — да плюс 23—29 градусаў. У паўднёвых і паўднёваўсходніх раёнах чакаецца плюс 30—33 градусы.

У аўторак—сераду, 22—23 жніўня, месцамі, пераважна па паўночнай палове краіны, пройдуць кароткачасовыя дажджы, магчымы навальніцы. Тэмпература паветра ўначы складзе плюс 10—17 градусаў, а днём — плюс 20—27 градусаў. Па паўднёвым захадзе тэмпература павысіцца да плюс 29 градусаў.

На свае вочы

# ПАДАРОЖЖА ПА СІМВАЛЕ ДЗЯРЖАЎНАСЦІ

**Палац Незалежнасці зноў сабраў гасцей, для якіх была арганізавана экскурсія. Такія падзеі сталі традыцыйнымі і нязменна праходзяць у шчырай і цёплай атмасферы. Гэтым разам пазнаёміцца з сімваламі беларускай дзяржаўнасці прыехалі прадстаўнікі маладзёжнага савета Дзяржаўнага вытворчага аб'яднання «Беларуснафта». Гэта аператары запраўачных станцый, інжынеры, геолагі, свідроўшчыкі, мантажнікі, ратавальнікі, якія працуюць не толькі ў Беларусі, але і за мяжой, рэалізоўваючы праекты па асваенні нафтагазавых рэсурсаў у краінах блізкага і далёкага замежжа. Для многіх з іх гэта першае наведванне Палаца Незалежнасці, і эмоцыі проста зашкальвалі ад убачанага і пачутага.**



Палац Незалежнасці — частка патрыятычнага квартала ў Мінску, у які таксама ўвайшлі Музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны і плошча Дзяржаўнага сцяга. У гэтым будынку праводзяцца не толькі афіцыйныя мерапрыемствы і пратакольныя сустрэчы. Палац Незалежнасці стаў універсальнай пляцоўкай для арганізацыі выстаў, маштабных прэзентацый, свят для дзяцей і моладзі.

Ахвотных наведаць Палац Незалежнасці, які з'яўляецца рэзідэнцыяй Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, заўсёды вельмі шмат. І нядзіўна: гэта найпрыгажэйшае збудаванне амаль у цэнтры сталіцы па праве стала візіткай Беларусі.

Традыцыйна экскурсія пачынаецца з самай вялікай залы ўрачыстых цырымоній, дзе праходзіць мноства важных мерапрыемстваў. Пераходзячы з залы ў залу, наведвальнікі не стамляюцца захапляцца аздабленнем залаў, якія створаны дзякуючы таленту нашых суайчыннікаў. Дзівосныя люстры, эксклюзіўная мэбля, карціны, мазаіка з паркета і мноства выдатных дэталяў ствараюць асаблівую атмасферу ў кожнай зале палаца. Дарэчы, усяго ў палацы 20 асноўных залаў, дзе праходзяць найважнейшыя мерапрыемствы.

«Я ў Палацы Незалежнасці ўпершыню. Гэта папраўдзе, доўгачаканая падзея як для мяне, так і для калектыву, у прыватнасці Маладзёжнага савета аб'яднання «Беларуснафта», — расказаў **геолаг другой катэгорыі кіравання геалогіі і распрацоўкі нафтавых радовішчаў цэнтральнага апарату РУП «Беларуснафта», намеснік старшыні Маладзёжнага савета вытворчага аб'яднання «Беларуснафта» па навуцы, інавацыях і стратэгічным развіцці Раман АСВІНАЎ.** — Гэта сімвал і аснова дзяржаўнасці нашай Беларусі».

Намесніка старшыні маладзёжнага савета ўразіў стыль, у якім увасоблены Палац Незалежнасці: «Цікава зазірнуць у тыя дарадчыя пакоі, вялікія залы палаца, дзе праходзілі знакамітыя не толькі для Беларусі, але і для ўсяго свету падзеі. Прызнацца, прыемнае пачуццё, калі ты дакранаешся да гэтага».





Як лічыць Раман Асвінаў, Палац Незалежнасці для моладзі — гэта, у першую чаргу, унікальная магчымасць дакрануцца да працэсу кіравання самой дзяржавай. «Маладое пакаленне з сучасных рэаліяў з'яўляецца драйверам у многіх галінах нашай эканомікі, і наведванне Палаца Незалежнасці — гэта тая самая магчымасць, якая дазваляе чалавеку ўсведамляць, што ён частка вялікага механізму, велізарнай супольнасці беларускага народа», — падкрэсліў ён.

Палац Незалежнасці сапраўды стаў месцам гонару беларусаў. Яго пабудавалі за 30 месяцаў замест 58 запланаваных, і ён на 90 % выкананы беларускімі майстрамі з айчынных матэрыялаў. Што характэрна, у афармленні выкарыстоўваецца нацыянальны арнамент — у мастацкім роспісу сцен, столяў, у мазаіцы і метале. Першых высокіх гасцей палац прыняў у кастрычніку 2013 года, амаль 10 гадоў таму.

«Мне давялося наведаць гэты сімвал незалежнасці і адзінства нашай нацыі ўпершыню, — расказала **начальнік выпрабавальнай лабараторыі даччынага прадпрыемства «Беларуснафта — Мінскаўтазапраўка» Святлана МАЦКО.** — Уражанні вельмі яркія, было прыемна пабываць у тых залах, дзе былі падпісаны, вырашаны пытанні сусветнага ўзроўню. Вельмі спадабалася ўбранне. Калі расказалі, што гэта ўсё было зроблена рукамі нашага беларускага народа, то, вядома ж, дзівішся таленту і разумееш, што мы высокага ўзроўню, вартыя гэтага!»

Безумоўна, наведванне Палаца Незалежнасці ў памяці кожнага застанецца незабыўнай падзеяй, якая падарыла магчымасць яшчэ раз адчуць гонар за родную Беларусь, за сваіх таленавітых суайчыннікаў.

**Данііл ХМЯЛЬНІЦКІ, фота аўтара.**

# Працаваць у сельскай гаспадарцы нялёгка, але цікава

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Давыдзенкай Вераніка стала зусім нядаўна, да гэтага была Кузняцовай. Дзяўчына паспяхова скончыла Віцебскую ветэрынарную акадэмію. Родам яна з Брэста, і апошнюю, пераддыпломную, практыку праходзіла ў сельгаспрадпрыемстве «За мір» Брэсцкага раёна. За чатыры месяцы яе практыкі кіраўніцтва названай гаспадаркі адзначала стараннасць, удумлівасць, прафесійную зацікаўленасць будучага спецыяліста. А калі да яе выпуску кіраўнік сельгаспрадпрыемства ўжо атрымаў прызначэнне на іншую пасаду і стаў займацца кадравым пытаннем на новым месцы, яна атрымала запрашэнне на вакантнае месца ветурача ў «Савушкіну пушчу».

Паколькі з мужам Паўлам яны ўступілі ў шлюб ужо пасля размеркавання, то яму давялося праходзіць непростую працэдуру пераразмеркавання, бо ён быў накіраваны ў Гомельскую вобласць. Але ўсе звязаныя з гэтым клопаты ўжо засталіся ў гісторыі, і маладая сям'я не тое што ўз'ядналася, але аказалася ў адным раёне. Муж маладога спецыяліста з «Савушкінай пушчы» атрымаў пасаду ветурача ў суседняй гаспадарцы «АграНіва».

«Мы вельмі рады, што ўдалося вырашыць пытанні з пераразмеркаваннем, — гаворыць Вераніка. — Як сямейная, я атрымала асобны пакой у інтэрнаце для маладых спецыялістаў. А мужу наогул у яго гаспадарцы выдзеліді дом, куды і я планую пераехаць пасля абавязковых двух гадоў адпрацоўкі.

Я таксама рада, што трапіла ў адно з вядучых сельгаспрадпрыемстваў вобласці. У свой час ААТ «Савушкіна пушча» было ўтворана шляхам аб'яднання трох гаспадарак Камянецкага раёна. Маштабы тут адпаведныя. Прадпрыемства з'яўляецца філіялам найбуйнейшага вытворцы малочных прадуктаў «Савушкін прадукт», а наша гаспадарка — адна з галоўных яго сыравінных баз. Штодзень на завод адпраўляецца больш за 60 тон малака. Мы, спецыялісты і працаўнікі, у адказе за яго бездакорную якасць, якая вызначаецца найперш здароўем пагалоўя».

«З першых дзён у гаспадарцы я зразумела, якая няпростая тут работа, — працягвае малады ветурач. — У нас, напрыклад, адзін выхадны дзень. Але ж відавочна, які ўнікальны вопыт работы я тут атрымаю. Тым больш што старэйшыя калегі заўсёды прыходзяць на дапамогу, падкажуць, навучаць. Найперш гэта галоўны ветэрынарны ўрач гаспадаркі Ганна Уладзіміраўна Чылііевіч. Зарплата ў сельгаспрадпрыемстве прыстойная, сацпакет — таксама, умовы для работы створаны, ад нас чакаюць добрасумленнай працы».

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

**Наталля МАНЬКО, начальнік аддзела кадравага і прававога забеспячэння камітэта па сельскай гаспадарцы і харчаванні Брэсцкага аблвыканкама:**

— Спачатку некалькі лічбаў. Летась установамі адукацыі аграрнага профілю ў сельскагаспадарчыя арганізацыі вобласці накіравана з вышэйшай адукацыяй 348 маладых спецыялістаў і 433 з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй. З іх 139 — гэта ветэрынарныя ўрачы і ветэрынарныя фельчары. У 2023 годзе ў гаспадаркі вобласці накіравана 165 спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй і 455 з сярэдняй спецыяльнай, якія прыступілі да работы да 1 жніўня.

Маладыя спецыялісты ў сельскагаспадарчых арганізацыях абавязкова забяспечваюцца жыллём, паколькі гэта з'яўляецца адным з асноўных матываў, каб працягнуць работу ў гаспадарцы. Напрыклад, летась маладым спецыялістам было выдзелена 97 дамоў (пакояў у доме), 30 кватэр, 118 пакояў у інтэрнаце, 49 чалавек атрымалі кампенсацыю аплаты за найм жылля. Пры гэтым 461 малады спецыяліст пражывае дома ў бацькоў, два маюць асабістае жыллё.

Важна, што калектыўныя дагаворы сельскагаспадарчых арганізацый маюць раздзелы па пытаннях жыллёвага будаўніцтва, паляпшэння жыллёвых умоў, там прапісаны льготы для маладых спецыялістаў.

Ва ўсіх сельгасарганізацыях за маладымі спецыялістамі замацоўваюцца настаўнікі з ліку вопытных працаўнікоў, якім прадугледжана матэрыяльнае заахвочванне. А тыя, хто пасля абавязковай адпрацоўкі заключаюць кантракт на працяг работы, атрымліваюць павышэнне зарплаты. У асобных гаспадарках Столінскага, Пінскага, Кобрынскага, Пружанскага раёнаў пачалі прымяняць практыку выплат у памеры 300—500 базавых велічынь тым з маладых спецыялістаў, хто заключае кантракт на пяць гадоў. Апошняе, несумненна, становіцца дзейсным спосабам замацавання спецыялістаў пасля абавязковай адпрацоўкі.

Адной з мер па замацаванні маладых людзей на сяле з'яўляецца накіраванне хадайніцтваў у раённыя (гарадскія) прызыўныя камісіі аб прызыве работнікаў сельгасарганізацый на службу ў рэзерве, а таксама аб атрыманні адтэрміноўкі праходжання тэрміновай ваеннай службы. Такія хадайніцтвы ўвайшлі ў практыку, пэўная іх колькасць задавальняецца.

**Тым часам**

# «Рэалізаваны новыя падыходы»

### Старшыня профільнай камісіі Савета Рэспублікі пракаментавала вынікі ўступнай кампаніі — 2023

***Ірына СТАРАВОЙТАВА, старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці:***

— Прыёмная кампанія — 2023 падыходзіць да свайго завяршэння. Для навучання за кошт сродкаў бюджэту залічана 27,8 тысячы абітурыентаў. У асноўным гэта дзённая форма атрымання адукацыі — 23,3 тысячы чалавек.

У гэтым годзе рэалізаваны новыя падыходы да прыёму на ўмовах мэтавай падрыхтоўкі. Залічэнне ажыццяўлялася па выніках вуснага экзамену ў ВНУ і сярэдняга бала атэстата. Студэнтамі мэтавай формы навучання сталі 3,5 тысячы чалавек. У рэгіянальныя ўстановы вышэйшай адукацыі прыём ажыццяўляўся ў тым ліку і па выніках універсітэцкіх алімпіяд — залічана 369 пераможцаў.

Пашыраныя магчымасці для паступлення мелі таленавітыя, матываваныя абітурыенты на запатрабаваныя эканомікай спецыяльнасці. Без уступных іспытаў залічана 240 пераможцаў міжнародных, рэспубліканскіх, абласных алімпіяд, а таксама больш за 260 выпускнікоў педагагічных, спартыўна-педагагічных, аграрных класаў, больш за 770 уладальнікаў залатога (сярэбранага) медаля і дыплома ПТВ або ўстановы ССА з адзнакай. Па выніках гутаркі прыняты на спецыяльнасці профіляў адукацыі «Тэхніка і тэхналогіі» і «Прыродазнаўчыя навукі» 23 выпускнікі Нацыянальнага дзіцячага тэхнапарка.

У гэтым годзе навучэнцы 11-х класаў праходзілі выніковую атэстацыю ў выглядзе цэнтралізаванага экзамену, вынікі якога ўлічваліся пры выстаўленні выніковай адзнакі ў атэстат аб агульнай сярэдняй адукацыі і залічваліся пры паступленні ва ўстановы вышэйшай адукацыі. Па выніках цэнтралізаванага іспыту атрымана 1660 стабальных вынікаў (3,1 працэнта).

# Тэлебачанне асвойвае новыя прасторы

**Беларусь і Туркменістан робяць новы крок для ўзмацнення супрацоўніцтва ў галіне інфармацыйнай палітыкі. Нядаўна адбылася сустрэча дэлегацыі Дзяржаўнага камітэта па тэлебачанні, радыёвяшчанні і кінематаграфіі Туркменістана з прадстаўнікамі Белтэлерадыёкампаніі. У ходзе перагавораў абмеркавалі магчымасці далейшага пашырэння вяшчання тэлеканала «Беларусь 24» на тэрыторыі Рэспублікі Туркменістан.**



Падчас візіту ў Мінск дэлегацыі Дзяржаўнага камітэта па тэлебачанні, радыёвяшчанні і кінематаграфіі Туркменістана разгледзелі перспектывы ўзаемадзеяння дзвюх краін у медыясферы. Бакі абгаварылі далейшае супрацоўніцтва ў галіне інфармацыйнай палітыкі, магчымасць сумеснай вытворчасці аўтарскіх матэрыялаў і планы па абмене кантэнтам паміж СМІ дзвюх краін, а таксама рэалізацыю медыйнай стратэгіі Беларусі на знешняй арэне і далейшае пашырэнне вяшчання міжнароднага тэлеканала «Беларусь 24» у Туркменістане. Прадстаўнікі гэтай краіны запрасілі беларускіх калег прыняць удзел у медыяфоруме, які адбудзецца ў іх у верасні, у дні святкавання незалежнасці рэспублікі.

Нагадаем, што міжнародны спадарожнікавы тэлеканал медыяхолдынга распаўсюджваецца ў пакетах аператараў спадарожнікавага і кабельнага тэлебачання, даступны анлайн на афіцыйным сайце belarus24.by, а таксама ў мабільных сэрвісах і на IPTV- і OTT-платформах. Каманда тэлеканала ўсебакова паказвае і распавядае замежным тэлегледачам пра тое, чым жывуць беларусы, якімі поспехамі ганарацца, як ставяцца да сваёй гісторыі і культуры. «Беларусь 24» кожны дзень і круглыя суткі ў высокай лічбавай якасці робяць нашу краіну больш блізкай і зразумелай для замежнай аўдыторыі.

**Алена ДРАПКО.**

**Фота Белтэлерадыёкампаніі.**

## ШАШКІ

**(«Звязда»)** Выпуск № 198

**№ 122**



**№ 122** Ю. Мурадаў (Барысаў)

Белыя простыя: c1, h2, c3, b4, h6 (5).

Чорныя простыя: g3, f4, h4, d6, e7, b8 (6).

**№ 123** Міхаіл Сцефановіч

Белыя простыя: a1, g1, h2, h4, c5, b6, f6, a7, e7 (9).

Чорныя простыя: a3, c3, e3, d4, g5, d6, h6, d8, f8, h8 (10).

**№ 124** Мікалай Ляшкевіч (Мінск)

Белыя простыя: d2, c5, g5, b6, f6, e7 (6).

Чорныя простыя: b2, f2, g3, h4, d6, a7 (6).

У шашкі-100 кампазіцыі даслаў Вадзім Булат (Мінск).

**№ 125**

Белыя простыя: 49, 43, 44, 36, 37, 38, 39, 33, 29, 15 (10).

Чорныя простыя: 35, 27, 21, 22, 25, 18, 11, 12, 13, 10, 4 (11).

**№ 126**

Белыя простыя: 41, 43, 36, 37, 31, 32, 34, 35, 27, 15 (10).

Чорныя простыя: 33, 29, 22, 23, 18, 11, 12, 13, 10, 4 (10).

Наступныя кампазіцыі ў шашкі-64 па бразільскіх правілах складзены вядучым рубрыкі.

**№ 127**

Белыя простыя: b2, h2, d4, f4, c5, e5, b6, d6 (8).

Чорныя простыя: d2, f2, g3, f6, a7, g7, f8 (7).

**№ 128**

Белыя простыя шашкі: b4, e5, d6, f6, e7, g7 (6).

Чорныя простыя шашкі: a3, e3, g3, f4, c5, дамка: a1 (6).

**№ 129**

Белыя простыя шашкі: d2, b4, e5, d6, f6, h6, e7 (7).

Чорныя простыя шашкі: g3, f4, c5, дамкі: a1, c1, a3 (6).

Ва ўсіх пазіцыях белыя пачынаюць і выйграюць. Прозвішчы чытачоў, якія дашлюць правільныя адказы, будуць апублікаваныя.

З лістоў чытачоў: «Дзякуем вядучаму-аўтару за творчасць! Усё рашалася з вялікай асалодай!» — піша Фёдар Карпей з Мядзела.

**Праверце свае рашэнні**

**Выпуск № 197 ад 04.08.2023.**

№ 114

1. c7-b8 a7:c5 2. b8-c7 d8:b6 3. c1-d2 f6:d8 4. b2-c3 d4:b2 5. d2-e3 f4:d2 6. e1:c7 d8:b6 7. h2:c1+

№ 115

1. f2-g3 a7:e3 2. c7-b8 f6:d4 3. b8-c7 d8:b6 4. g3-f4 e3:g5 5. h4:h8+

№116

1. b4-a5 f4:b4 2. a5:c7 d8:b6 3. d4-e5 f6:d4 4. h4:h8+

№ 117 1. f2-g3 a7:c5

[1…h2:d2 2. e7-f8 a7:e7 3. f8:f8 x ]

2. e7-f8 c5:e7

[2…h2:d2 3. f8:a3 c5:e7 4. a3:f8 x ]

3. f8:c1 h2:d2 4. c1:f8 x

№ 118

1. d6-c7 f4:b8 2. b6-c7 b8:d6 3 .b2-c3 d2:b4 4. a3:e7 f8:d6 5. h6:h4+

№ 119 1. 21-16 48:28 2. 22:08 03:21 3. 16:38 46:43

[ 3...06:42 4. 47:38 ]

4. 49:38 06:42 5. 47:38+

№ 120 1. 27-22 36:07 2. 17-12 03:42 3. 48:01 06:50 4. 01-06 50-44 5. 06:50+

№ 121

1. 23-19 14:23 2. 27-21 36:07 3. 17-12 03:42 4. 48:01 06:50 5. 01-06 50-44 6. 06:50+

Першымі дакладныя адказы даслалі: А. Галаванаў, Э. Дамброўскі, П. і В. Шульгі (усе Мінск), Ф. Карпей, Л. Жыхар (абодва Мядзел), У. Панько (Камянец), І. Ананіч (Гродна), С. Рашэцін (Ашмяны), В. Таўкачоў (в. Уздзевічы, Клімавіцкі р-н, Магілёўская вобл.).

**«Пішыце на адрас: газета «Звязда», г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, 220013, e-mail: info@zviazda.by або vorush@yandex.ru**

**Віталь ВАРУШЫЛА, майстар спорту.**

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

## ШТО ПАЧЫТАЦЬ У ЧАСОПІСЕ «АЛЕСЯ» Ў ЖНІЎНІ




### «РАШЭННІ — УЗВАЖАНЫЯ І ПРАДУМАНЫЯ — ПРЫМАЮ ХУТКА»

— Я прывыкла шмат працаваць, рабіць усё хутка і рашэнні — узважаныя і прадуманыя — прымаю гэтак жа хутка. Так, прадуманыя, таму не баюся за іх, але, здараецца, перажываю, — кажа першы намеснік старшыні Мінгарвыканкама Надзея Лазарэвіч.

У 2018 годзе яе прызначылі генеральным дырэктарам ААТ «Кіруючая кампанія холдынга «Бабруйскаграмаш». Прыехаўшы на стратнае прадпрыемства, Надзея Лазарэвіч не спалохалася, наадварот: зразумела — справіцца. І праз паўгода прадпрыемства стала выходзіць на чысты прыбытак.

Якія якасці характару дапамаглі Надзеі Лазарэвіч стаць лідарам? Як яна спраўляецца з вялізным спісам абавязкаў? Чаму, пры ўсёй сваёй занятасці, лічыць важным знаходзіць час для работы ў Беларускім саюзе жанчын? Каму ўдзячная за жыццёвыя ўрокі? Пра гэта і многае іншае — у інтэрв'ю першага намесніка старшыні Мінгарвыканкама Надзеі Лазарэвіч часопісу «Алеся».

### АКТРЫСА, ПЕДАГОГ, ШМАТДЗЕТНАЯ МАМА

А яшчэ Ганна Анісенка — адзін з першых бальнічных клоўнаў у Беларусі. Жанчына, якая перамагла анкалогію. Аптыміст, у якога варта павучыцца такому складанаму мастацтву, як мастацтва жыць.

— У тэатры не бывае лёгка, — перакананана Ганна Анісенка. — Разам з тым тут заўсёды можна атрымаць задавальненне — ад цікавай ролі, ад ігры з партнёрамі, рэакцыі публікі. Гэта складаны свет, але калі яго любіш, у ім знаходзіш крыніцу натхнення і апору.

Акрамя акцёрскай прафесіі, Ганна Анісенка рэалізоўвае сябе як рэжысёр і педагог у школе-студыі «Авансцэна» пры Камерным драматычным тэатры. На працягу 22 гадоў у вольны час працавала бальнічным клоўнам. А яшчэ адна з самых галоўных для яе роляў — роля мамы.

Пра тое, як годна праходзіць праз драматычныя моманты жыцця, пра сілу духу, цікаўнасць і невычэрпны аптымізм — у гутарцы з Ганнай Анісенка.

### «У АНТАРКТЫДЫ І ЖАНЧЫН ШМАТ АГУЛЬНАГА» —

так лічыць намеснік кіраўніка Рэспубліканскага цэнтра палярных даследаванняў Аляксей Гайдашоў, які ўзначальваў усе беларускія антарктычныя экспедыцыі, у тым ліку і 15-ю, якая завяршылася ў чэрвені 2023 года. За час, прысвечаны вывучэнню паўднёвага кантынента Зямлі, Аляксей Гайдашоў па-сапраўднаму палюбіў яго.

У рубрыцы «Мужчынскі погляд» вядомы палярнік расказвае, як прыйшоў у прафесію, як удалося пабудаваць моцную сям'ю, на якіх прынцыпах выхоўваў сыноў. А таксама пра ўзаемаадносіны ў мужчынскім калектыве ва ўмовах вечнай мерзлаты і пра тое, чаму Антарктыда нагадвае яму жанчын:



— У Антарктыдзе кожны дзень поўны нечаканасцяў, небяспекі, радасцяў, адкрыццяў, так і з жанчынамі, па-мойму: ніколі дакладна нельга прадказаць, што яны здольныя зрабіць, чым яшчэ здзівіць.

### «ЗАГАДКАВЫ РАЙ» ТАЦЦЯНЫ ЯЦУК

У дзесяці паэтычных зборніках настаўніцы, маці двух сыноў, кіраўніка баранавіцкага літаратурнага аб'яднання «Купальскія зоры» Таццяны Яцук зіхацяць зоркамі жыццёвай мудрасці космас шчырай, адкрытай людзям жаночай душы. Сваю шчаслівую сцяжыну ў гэтым свеце Таццяна Яцук знайшла ў маладосці і ўжо з яе не збочвала.

Вершаваныя радкі прыходзяць да паэткі ў хвіліны і радасці, і суму. У 2022 годзе яна стала лаўрэатам прэстыжнага літаратурнага спаборніцтва Гродзеншчыны — IV абласнога конкурсу рукапісаў імя Цёткі ў намінацыі «Паэзія» і выдала кнігу «Зоркі ў прыполе».

— У аснову вершаў кнігі ляглі філасофскія высновы, своеасаблівыя «мудрынкі», якія пакрысе збірала на цярністай жыццёвай дарозе, — прызнаецца Таццяна Яцук.

А яшчэ з адказаў паэткі на пытанні часопіса чытачы даведаюцца, як зацікавіць сённяшніх школьнікаў беларускай літаратурай. І які ён, рэцэпт сямейнага шчасця ад аўтаркі кнігі «Зоркі ў прыполе».

### ЯК НЕ СТАЦЬ ЗАЛОЖНІКАМ БІЯЛАГІЧНАГА ЎЗРОСТУ?

Саракагоддзе для многіх з'яўляецца пераломным і ўспрымаецца як своеасаблівая мяжа. І гэта нягледзячы на тое, што якасць і працягласць жыцця сучаснага чалавека павялічваюцца. Насамрэч для такога меркавання ёсць сур'ёзныя прычыны, як псіхалагічныя, так і фізіялагічныя.

Чаму да надыходу сярэдняга ўзросту трэба рыхтавацца ўжо ў юнацтве? Як хуткасць хады ўплывае на біялагічны ўзрост чалавека? І што павінны рабіць людзі ва ўзросце за сорак, каб адцягнуць надыход старасці? На гэтыя і іншыя пытанні адказвае нейрахірург, навуковы супрацоўнік аддзялення пухлін галаўнога мозгу РНПЦ анкалогіі і медыцынскай радыялогіі імя М. М. Аляксандрава, выкладчык кафедры неўралогіі і нейрахірургіі БелМАПА Гумен Гарбаніждад.

### КАСМЕТЫКА З ГРАДКІ, МОДНЫЯ САРАФАНЫ І РЭЦЭПТЫ ПІРАГОЎ СА СЛІВАЙ

Са жнівеньскага нумара «Алесі» вы даведаецеся пра натуральныя сродкі для догляду скуры твару. А таксама пра тое, якія сарафаны модныя ў гэтым сезоне, чым карысная сліва і што з яе можна прыгатаваць, ды пра іншае.

**Алена ВАЛЕР'ЕВА.**

### Беларусь 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00** Навіны.
**7.05, 8.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10, 18.15, 0.00** Зона Х (16+).
**9.10** Галоўны эфір.
**10.40** Навіны надвор'я.
**11.00, 12.15 Меладрама «Прыгажуня і здзей» (12+).**
**13.05, 15.25 Меладрама «Халоднае сэрца» (12+).**
**15.10, 18.00** Навіны рэгіёна.
**17.05** Беларуская часінка.
**18.35, 19.20 Меладрама «Скажы праўду» (16+).**
**21.00** Панарама.
**21.45** Зразумелая палітыка.
**22.00 Серыял «След» (16+).**
**23.45** Арэна.
**0.20** Дзень спорту.

### Беларусь 2

**6.00** «Уключайся!» (12+)
**10.00, 14.40, 22.35** Тэлебарометр.
**10.05** «Сакрэты». Дак. драма (16+).
**10.35** «Я з вёскі» (12+).
**11.05 Дэтэктыў «Доказы з мінулага. Раман без апошняй старонкі» (16+).**
**15.10, 0.10** «На тыдзень» (16+).
**15.55** «Камень, нажніцы, папера» (16+).
**16.30** «Крэпасць: шчытом і мячом» (0+).
**17.45 Дэтэктыў «Акваторыя» (16+).**
**19.15** «Сляпая» (16+).
**19.45** «Знакі лёсу». Дак. драма (16+).
**20.10** «Сям'я. Перазагрузка». Дак. драма (16+).
**20.45, 21.15 Дэтэктыўны серыял «Вонкавае назіранне».**
**21.10** Спартлато 6 з 49, КЕНА.
**22.40 Драма «Каранаваны блазан» (16+).**

### Беларусь 3

**7.00** «Дабраранак».
**7.35** «Беларуская кухня».
**8.05, 13.00, 14.55, 20.30, 22.30** «Навіны культуры».
**8.15, 19.00 «Зіна-Зінуля». Маст. фільм (12+).**
**9.45** «Нацыянальны хіт-парад».
**10.40 «Прыгоды Бураціна». Маст. фільм (6+).**
**13.05, 21.05 «Бландзінка за вуглом». Маст. фільм (12+).**
**14.30** «Наперад у мінулае».
**15.05** «Навука побач» (6+).
**15.35** «Суразмоўцы».
**15.50 «Салодкая жанчына». Маст. фільм (12+).**
**17.25** «Люблю і памятаю».
**18.10** «Зоры-зоркі».
**20.40** «Калыханка» (0+).
